**Пяцькоў, І.** Медаль воіну-інтэрнацыяналісту / І. Пяцькоў // Ленінскі прызыў (Орша). — 1990. — 13 студз. — С. 4.

## МЕДАЛЬ ВОІНУ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТУ

На працягу амаль двух гадоў Ігар Даўгалёў служыў у дэсантна-штурмавым батальёне. Разам са сваімі сябрамі ўдзельнічаў у баях з душманамі ў Афганістане недалёка ад горада Кандагар.

На сваім «КамАЗе» Ігару даводзілася выконваць адказнае задание камандавання – дастаўляць снарады. А гэта значыць, што трэба было рызыкаваць сваім жыццём – дарога, якая пралягала паміж скаламі, абстрэльвалася варожымі кулямётамі і мінамётамі.

За мужнасць і гераізм пры выкананні задання камандавання ваенны вадзіцель Даўгалёў быў узнагароджан медалём «За баявыя заслугі». Але ад незалежачых ад яго прычынах баявая ўзнагарода яму не была ўручана.

І толькі днямі былому воіну-інтэрнацыяналісту, а цяпер шафёру ва ўрачыстай абстаноўцы была ўручана заслужаная ўзнагарода.

Такім чынам, да баявога медаля, які маладому аршанцу быў уручаны ўрадам Афганістана, прыбавілася яшчэ адна ўзнагарода – савецкая.

**І. Пяцькоў**